Со второй половины XIX в. в Витебске возрождается производство печного кафеля, который был более простой, чем кафель XVII века, на смену полихромии пришла однотонная раскраска или белый тон с золотой обводкой. Кафель XIX века выглядит монотонным и одноплановым. В характере декора витебского кафеля конца XIX – начала XX в. преобладает стиль модерн, особенно в рисунках растительного характера. Кафель и декоративная плитка, выпускаемые в это время в Витебске, отличаются заумным переплетением геометрического орнамента, вытянутыми стеблями сучьев и листьев, своеобразным изображением цветов. Витебские мастера также пытались «оживить» непонятные народу заграничные изображения, придать им местный колорит, что в значительной степени им удалось, и определило большой спрос [1, с. 277].

Список использованных источников


1. Русецкий, А. В., Русецкий, Ю. А. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года / А. В. Русецкий, Ю. А. Русецкий. – Мн. : БелЭн, 2001. – 288 с.
2. Левко, О. Н. Витебск / О. Н. Левко. – Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2010. – 335 с.


УДК 821.161.3

## ФІЛАСОФСКАЯ ЛІРЫКА А. М. КАНАПЕЛЬКІ


***Уткевіч В. І., к.філал.н., дац.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*



Рэферат. *Артыкул прысвечаны аналізу філасофскай лірыкі беларускага паэта А. М. Канапелькі. У ёй знаходзіць адлюстраванне асаблівы склад мыслення паэта, яго светапогляд, у згодзе з якімі вядзецца мастацкі пошук у лірычных творах. Найперш гэта філасофія любові да роднай зямлі, да свайго народа і да беларускай мовы. Асаблівую ўвагу А. Канапелька надае вершам-разважанням у падарожжах, аўтар разглядае розныя аспекты чалавечага быцця на фоне часу і вечнасці.*


Ключавыя словы: А. М. Канапелька, філасофская лірыка, вечнасць, жыццё, мова, чалавек, час.

Анатоль Мікалаевіч Канапелька (1939–2002) – беларускі паэт, перакладчык, літаратуразнаўца, член Саюза беларускіх пісьменнікаў. Амаль усё яго жыццё прайшло на Віцебшчыне: нарадзіўся ў Расонах, школьную адукацыю атрымаў у Полацку, працаваў у Віцебску. З сярэдзіны 1960-х і да канца жыцця выкладаў у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава, быў загадчыкам кафедры беларускай літаратуры, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Яго пяру належаць такія паэтычныя зборнікі як «Зямная сімфонія» (1966), «Сустрэчы» (1979), «Музыка лістапада» (1999). З'яўляецца аўтарам-складальнікам зборніка біяграфій паэтаў, жыццё і творчасць якіх былі звязаны з Віцебшчынай. Перакладаў на беларускую мову творы з рускай, польскай, цыганскай.

Дадзенае даследаванне прысвечана разгляду філасофскага аспекту творчасці паэта. Папярэдне неабходна адзначыць, што само паняцце «філасофія» мае вялікую колькасць тлумачэнняў і значэнняў. Разгледзім тры найболей распаўсюджаныя з іх. Па-першае, у межах старажытнагрэчаскай традыцыі філасофія – гэта метафізіка, значыць вучэнне аб нематэрыяльным свеце, які з'яўляўся першапрычынай усяго існага. Па-другое, пад філасофіяй разумеюць пэўную спарадкаваную сістэму ведаў, аб'яднаных агульнай ідэяй. І, нарэшце, трэці распаўсюжаны падыход трактуе філасофію як навуку, дысцыпліну, якая вывучае самыя агульныя законы быцця прыроды, грамадства і чалавечага мыслення. Усе пералічаныя тлумачэнні так ці інакш актуалізаваліся праз мастацкі падыход літаратараў. Вытокі айчыннай філасофскай лірыкі знаходзім напрыканцы XVIII ст. Першымі паэтамі гэтай эпохі, у чыіх творах дадзены кірунак знайшоў сваё адлюстраванне, з'яўляліся Г. Р. Дзяржавін і Я. А. Баратынскі, яны мастацкімі сродкамі раскрывалі найважнейшыя пытанні чалавечага быцця: жыцця і смерці, узаемасувязі чалавека з прыродай, законы гістарычнага развіцця грамадства, прызначэнне мастацтва і многія іншыя. Прычым іх вершы ўяўляюць сабой некаторую адзіную сістэму разважанняў, заснаваную на аналітычных

пастулатах, якія ўключаюць у сябе спарадкаваную аргументацыю. Наступны этап яднання філасофіі і паэзіі можна аднесці да сярэдзіны 1820-х гадоў, гэта значыць да часу ўзнікнення гуртка «Таварыства любамудрасці». Яго ўдзельнікі імкнуліся да стварэння новага мастацтва, падпарадкаванага выключна філасофскім прынцыпам. У XIX – пачатку XX стст. філасофская лірыка працягнула сваё развіццё ў творах Ф. І. Цютчава, А. А. Фета, Д. С. Мераждкоўскага, І. Ф. Анненскага, В. І. Іванава, З. М. Гіпіус, Ул. С. Салаўёва.

Не засталіся ў баку і беларускія паэты. Ужо пачынаючы ад класікаў, Я. Купалы і Я. Коласа, з канца XIX ст. філасофская тэматыка гучыць і на беларускай мове. На наш погляд, творчасць А. М. Канапелькі ў многіх адносінах з’яўляецца арганічным працягам рускай і беларускай паэтычнай філасофскай традыцыі. Хоць XX стагоддзе, безумоўна, расставіла свае акцэнты. Сучасных паэтаў больш цікавяць перасячэнні навукі і рэлігіі, пошукі сэнсу быцця чалавека і чалавецтва, суадносіны космасу і хаосу. Філасофская лірыка А. Канапелькі не абмяжоўваецца толькі сваім унутраным зместам: у ёй знаходзіць адлюстраванне асаблівы склад мыслення паэта, яго светапогляд, у згодзе з якімі вядзецца мастацкі пошук у лірычных творах. Найперш у віцебскага творцы адлюстроўваецца такі кірунак, як філасофія любові да роднай зямлі, да свайго народа і да беларускай мовы. Напэўна, найбольш вядомы верш А. Канапелькі, які зрабіўся ўжо хрэстаматыйным – гэта «Роднае слова»:

Адкрываю,
як свет,
нанова
беларускае
роднае
слова,
пералівістае –
як каменьчык,
вясёлкавае –
як ручэй […]
светлае –
як маланка,
гнеўнае –
як пярун,
ціхае –
як калыханка,
вечнае –
як Беларусь! [1, с. 12].

Вядома, пра любоў і прыцягненне роднай мовы пісалі практычна ўсе беларускія паэты. Аднак у А. Канапелькі роднае слова валодае значнымі анталагічнымі ўласцівасцямі, разнастайнымі і нават супярэчлівымі. Да таго ж, іх пералік у радках верша стварае амаль музычны вобраз: дэманструецца, якім чынам з дысанансаў нараджаецца кансананс. Адзначым, што ўся гэта фармальная супярэчлівасць знаходзіць у паэта свой дыялетычны развяз у апошнім радку верша, у якім роднае слова характарызуецца так: «вечнае – як Беларусь». Філасофская сувязь надзённага, бачнага з вечнасцю яшчэ ў больш глыбокім раскрыцці прадстаўлена ў іншым вершы «Я параўнаю з дзівасілам…». Першапачаткова, як вядома, ідэя жыватворчага Слова выразна выяўлена ў Бібліі, як у Старым Запавеце (у кнізе Быццё), так і ў Новым Запавеце (Евангелле ад Іаана). У такім кантэксце слова нават не належыць чалавеку, яно зыходзіць ад Бога. Для беларускага паэта роднае слова, мова таксама адцягнены ад чалавека, але бачацца спароджанымі роднай зямлёй. Паэт хоча сказаць аб анталагічнай укаранёнасці дадзеных феноменаў:

Магчыма,
тым і ганаруся,
што з нашай глебы прарасло
і сонца
вечнай Беларусі,
і мовы
вешчае святло! [1, с. 38].

Падкрэслім, што праблема непарыўнай узаемасувязі чалавечага быцця з часам і вечнасцю ў паэтычных творах А. Канапелькі паўтараецца дастаткова часта. Развагі аб вечнасці ў кантэксце традыцый айчыннай культуры і філасофіі ў мысліцеляў і пісьменнікаў

знаходзяць свой выраз ў хрысціянскіх ідэях. У вершы «Дум акіян» паэт, задаўшы сабе пытанне аб тым, якой дарогай ісці яму па жыцці, наступным чынам адказвае на яго:

Я ступаю
той,
каб вечна
ісці за табой,
СОНЦА! [1, с. 58].

Звернем увагу на тое, што ва ўмовах пануючага атэізму савецкага часу, калі жыў творца, аўтар не мог адкрыта выказваць рэлігійныя погляды. Паэтычны твор з падобнага кшталту ідэямі проста не мог быць апублікаваны. Аднак у самім слове «СОНЦА» невыпадкова ўсе літары вялікія. Як вядома, Ісуса Хрыста алегарычна называюць якраз «Сонца Праўды». Можна меркаваць, што пад сонцам у вершы разумеецца не толькі і не столькі зорка, але ісціна, праўда, справядлівасць, урэшце – сам Бог, да якіх спрадвечна і заўсёды імкнецца чалавек.

Імкненне філасофскай паэзіі да ўсеагульнасці і ўніверсальнасці звычайна якасна змяняе суб’ект дзеяння ў вершы. Адбываецца шэраг трансфармацый з фігурай лірычнага героя: аўтарская свядомасць выяўляецца ў першую чаргу праз абагульненыя і пазаасабовыя формы. Аднак, у вершах А. Канапелькі ўсё дакладна наадварот: усе агульныя і метафізічныя рэчы ён асэнсоўвае і дзеліцца гэтым асэнсаваннем толькі праз вопыт свайго ўласнага «я» – гэта найбольш частотны займеннік у творах паэта. Неабходна адзначыць, што ў філасофскай лірыцы адпачатку аўтары часта выкарыстоўваюць такі метад лагічнага пазнання як аналогію. Прывядзем некалькі прыкладаў у гэтым накірунку з творчасці беларускага паэта і звернем увагу зноў на асабістасць успрыняцця:

Я – човен. Плыву па рацэ.
А рака цяче ў акіян.
Вясло
у тваёй руцэ,
Як чайкі крыло…[1, с. 57].

Або чытаем у іншым вершы:

Адчыняю акно…
І раніца
ластаўкай
заляцела ў пакой [1, с. 56].

Найбольш цікавай у філасофскім стаўленні, на наш погляд, уяўляецца аналогія паміж Зямлёй і яблыкам. Адзін з вершаў пачынаецца наступнымі словамі:

Трымаю яблык,
як маленькую планету,
напоўненую сонцам і жывіцай [1, с. 46].

Вядома, паэт не раскрывае цалкам, на чым менавіта грунтуецца яго аналогія, у дадзеным выпадку гэта прыгожы паэтычны вобраз, але рызыкнем выказаць здагадку, што тут аналогія пабудаванава на генэзісе. Яблык, як плён, спараджаецца дрэвам. Зямля ж у такім прачытанні таксама ўяўляецца спараджэннем пэўнага сусветнага дрэва жыцця.

Асаблівую ўвагу А. Канапелька надае вершам-розважанням у падарожжах. Шляхі паэта праходзілі па ўсёй Беларусі (вершы «Аўтобус дрогкі, ды не бяда», «Яшчэ далёка наш прывал»), таксама ён паэтычнаператварае свае ўражанні ад вандровак па Расіі («На смаленскай дарозе», «Сапшо», «Сустрэча з Ладагай») і Прыбалтыцы («Літва», «Я размаўляю з Балтыкай»). Аб’ядноўвае іх філасофская думка, што усё чалавечае жыццё – толькі падарожжа, падчас якога важна захаваць годнасць і чалавечнасць, даражыць кожным днём, кожнай новай сустрэчай.

Напрыканцы адзначым, што ў беларускай літаратуры канца ХХ – пачатку ХХІ стст. склаўся адметны накірунак інтэлектуальнай філасофскай лірыкі, прадстаўлены такімі імёнамі, як М. Танк, А. Куляшоў, А. Вярцінскі, Р. Барадулін, А. Разанаў, А. Канапелька і інш. Вершатворы адзначаных паэтаў аб’яднаны характэрнай асаблівасцю, якая складае адметнасць айчыннай філасофскай лірыкі – ўсведамленне свету і чалавека ў іх адбываецца ў накірунку ад пачуццёвасці да глыбокага роздуму. Філасофскі накірунак ў паэзіі, філасофскія матывы ў вершах дапамагаюць чытачу на нейкі час спыніцца і падумаць аб рэчах, якіх ён, магчыма, не заўважаў, яны фарміруюць светапогляд і светаўспрыняцце. Чытач можа пагадзіцца з аўтарскім пунктам гледжання і пафіласофстваваць разам, аднак можа і крытыкаваць, адхіліць погляд творцы, хоць тэма ад гэтага не страціць сваёй важнасці

і актуальнасці. Натуральна, шмат у чым успрыманне філасофскай лірыкі залежыць ад асабістага досведу, як аўтара, так і чытача, а гэта, у сваю чаргу, можа зрабіцца падмуркам і глебай для ўласнай творчасці, мастацкай або навуковай.

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Канапелька, А. Сустрэчы: Вершы / А. Канапелька. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1979. – 72 с.


УДК 001:94(476)

# ВЕНЦАСЛАЎ ВЕНЦАСЛАВАВІЧ ПЕЛІКАН – ВЫДАТНЫ ВУЧОНЫ І ТАЛЕНАВІТЫ АДМІНІСТРАТАР


***Хаданёнак В. М., к.г.н., дац.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*



Рэферат. *У артыкуле разглядаецца жыццёвы і творчы шлях К. А. Касовіча, ураджэнца Беларусі, вядомага навукоўца і педагога, які зрабіў вялікі ўклад у станаўленне сучаснага ўсходазнаўства і быў вядомы перакладамі ключавых помнікаў старажытнай літаратуры.*



Ключавыя словы: судовая медыцына, хірургічная паталогія, Віленскі ўніверсітэт, Віленскае таварыства лекараў, Віленская медыка-хірургічная акадэмія, рэформа ваеннай медыцыны.


На мяжы XVIII–XIX стст. паступова пачалі закладвацца асновы беларускай навукі, адным з асноўных накірункаў якой была медыцына. Нашы суайчыннікі шмат зрабілі для развіцця аховы здароўя не толькі на тэрыторыі ўласна беларускіх губерній, але і Расійскай імперыі.

Тэма развіцця медыцыны ў разглядаемы перыяд атрымала асвятленне яшчэ ў савецкі час. Працы Кручка Г. Р., Міцельмахерыса В. Г., Касцейка Л. А., Ялейнікавай В. С., Грыцкевіча В. П. разглядалі пытанні станаўлення арганізацыі аховы здароўя і медыцынскай дапамогі з пункту гледжання савецка-марксісцкай ідэалогіі, удзяляючы значную ўвагу пытанням удзелу ўрачоў у барацьбе з царызмам. У сучаснай беларускай і расійскай гістарыяграфіі вызначаную тэматыку распрацоўваюць Ігнатовіч Ф. І., Казей Л. І., Кульпановіч О. А., Мірскі М. Б., Панцюк І. В., Пііліпцэвіч Н. Н., Эльяшэвіч Е. Г. і інш.

Разам з тым, калі праблемы арганізацыі медыцынскай справы і медыцынскай адукацыі разгледжаны і прааналізаваны даследчыкамі, звесткі пра беларускіх навукоўцаў-медыкаў маюць фрагментарны, а часам і дастаткова супярэчлівы характар.

Агульнасусветныя ідэі і наваўвядзенні ў вобласці медыцыны пранікалі ў XVIII–XIX ст. і на беларускія землі. У той час у нас адсутнічала дзяржаўная сістэма аховы здароўя, не хапала ўрачоў і бальніц. Рэарганізацыя медыцынскай справы, шырокае выкарыстанне новых методык, перайманне перадавога вопыту неўзабаве прынесла плён. Са сценаў Віленскага ўніверсітэта і медыка-хірургічнай акадэміі выйшла цэлае суквецце медыкаў-даследчыкаў, якія зрабілі ўнёсак не толькі ў беларускую, але і ў сусветную медыцынскую навуку і практыку. Адным з іх быў Венцаслаў Венцаслававіч Пелікан. Ён нарадзіўся 11 верасня 1790 г. у Слоніме ў сям'і музыканта мясцовага аркестра.

Род В. Пелікана паходзіў з дробнай шляхты. Пачатковую адукацыю Венцаслаў Венцаслававіч атрымаў у школах Слоніма і Маладзечна. У 1809 г. ён праслухаў поўны курс філасофскіх навук у інстытуце пры Віленскім універсітэце, у тым жа 1809 г. паступіў у Пецярбургскую медыка-хірургічную акадэмію, якую паспяхова скончыў у 1813 г. з залатым медалём.

Ужо ў 1812 г. Венцаслаў Пелікан напісаў і выдаў падручнік па мікалогіі, дзе прапанаваў пры трэпанацыі чэрапа не рассякаць крыжападобна цвёрдую мазгавую абалонку (як гэта было агульна прынята тады ў хірургаў), а ў выпадках субдуральных гематом наносіць некалькі адтулін у яе зоне, праз якія адсмоктваць кроў і яе згусткі, што засцерагала ад мазгавых кіл і іншых істотных ускладненняў. У галіне хірургіі апісаў выпадкі лячэння анеўрызма падкаленкавай ямкі, запаленні вен. Ён адным з першых пачаў перавязваць падуздышную, сцегнавую і агульную сонную артэрыі, апярэдзіўшы ў гэтай галіне медыцыны